*Людміла Ніжэвіч*

# Дзе прайшло маленства

*Літаратурны музей Кузьмы Чорнага ў Цімкавічах (філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры)*

«...Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма...» — так пісаў Кузьма Чорны ў артыкуле «У імя будучыні» восенню 1941 года. Згадваюцца і словы Гётэ, які ў свой час казаў: «Калі хочаш зразумець паэта, пабывай на яго радзіме». Гэтыя два выказванні непарыўнай сувяззю звязаны паміж сабой, маюць глыбокі сэнс і трапна ўпісваюцца ў кантэкст асэнсавання творчай спадчыны вядомага беларускага празаіка Кузьмы Чорнага.

У дзённіку, які К. Чорны пачаў весці 2 ліпеня 1944 года, ёсць запіс: «...Родныя мае мясціны. Як мая душа рвецца туды! Яна заўсёды там. Там жывуць усе мае персанажы. Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія я калі-небудзь пісаў. Гэта ўсё адтуль, сапраўднае...». 8 жніўня з'яўляецца яшчэ адзін шчымлівы, кранаючы запіс: «...можа, мне суджана яшчэ пабачыць мілыя Цімкавічы. А што, калі і хата мая асталася і стаіць? Гэта будзе вялікае шчасце. Там жа, у ціхім жыцці можна будзе ачуняць як мае быць і напісаць усе задуманыя раманы...».

З бацькоўскай зямлёй, з роднымі, мілымі сэрцу мясцінамі звязаны былі творчыя і жыццёвыя памкненні пісьменніка. У вобразах і характарах яго твораў цімкаўляне знаходзілі сябе, што, бясспрэчна, было падставай для гонару, а сам Кузьма Чорны прызнаваўся, што пісаць аб земляках яму хапіла б на ўсё жыццё.

Не збылася мара пісьменніка. Кузьма Чорны не пабачыў «мілыя Цімкавічы», не дапісаў задуманыя раманы, але ўжо больш за пяцьдзясят гадоў да яго ў музей на паклон і споведзь прыходзяць удзячныя землякі.

24 чэрвеня 1964 года ў Цімкавічах быў адкрыты Літаратурны музей Кузьмы Чорнага. Капыльская раённая газета «Слава працы» ад 30.06.1964 г.

змясціла рэпартаж У. Гурыновіча аб гэтай падзеі, дзе былі такія радкі: «...На ўрачыстае адкрыццё музея прыехалі народны мастак БССР, вядомы скульптар Заір Ісакавіч Азгур, беларускія пісьменнікі Анатоль Астрэйка, Сцяпан Александровіч, Іван Кудраўцаў... Сярод ганаровых гасцей — сёстры Кузьмы Чорнага Марыя Карлаўна і Ганна Карлаўна Раманоўскія... Першы на Капыльшчыне музей гасцінна расчыніў свае дзверы перад наведвальнікамі. Плённа папрацавалі настаўнікі і вучні, каб пабудаваць і абсталяваць музей...». За гэтымі апошнімі радкамі сапраўды стаіць вялікая шматгадовая праца настаўнікаў і вучняў мясцовай школы, якой у 1950 годзе было прысвоена імя Кузьмы Чорнага. Ідэя збіраць і вывучаць творчую спадчыну свайго земляка ўзнікла яшчэ напрыканцы 1940-х гадоў. Ініцыятарам, а пасля і нязменным дырэктарам музея была заслужаная настаўніца БССР (1957) Зінаіда Іосіфаўна Раманенка. Яе энтузіязм і жаданне, запал і энергія, нібы ланцужковая рэакцыя, перадаліся і настаўнікам, і вучням, якія актыўна ўключыліся ў работу. Збор экспанатаў, выраб у школьнай майстэрні вітрын, афармленне экспазіцыі — усё гэта прыносіла задавальненне і выконвалася з разуменнем і адказнасцю.

Вялікую дапамогу ў зборы матэрыялаў аказалі жонка пісьменніка Рэвека Ізраілеўна Раманоўская, сёстры — Марыя і Ганна, дачка Адама Бабарэкі Алеся, якая добра ведала Кузьму Чорнага, сябар і паплечнік пісьменніка Уладзімір Дубоўка, а таксама супрацоўнікі Літаратурнага музея Я. Купалы і Мемарыяльнага музея Я. Коласа, Саюз пісьменнікаў БССР.

Сабраныя матэрыялы былі змешчаны ў раздзелы экспазіцыі па наступных тэмах:

1. Пачатак творчай дзейнасці Кузьмы Чорнага.
2. Творчасць Кузьмы Чорнага 1920 — 1930-х гадоў.
3. Кузьма Чорны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
4. Кузьма Чорны і беларускі тэатр.

Сярод экспанатаў, што распавядалі пра жыццё і творчасць Кузьмы Чорнага, былі фотаздымкі, прыжыццёвыя выданні кніг пісьменніка, фотакопіі рукапісаў ваенных гадоў, асабістыя рэчы. Найбольш каштоўныя з іх — паліто, самавар, а таксама абрус, вытканы маці Гліцэрыяй Міхайлаўнай Раманоўскай.

Музей плённа працаваў, папаўняўся экспанатамі. Савет музея, у які ўваходзілі настаўнікі і вучні, вёў актыўную працу па прапагандзе творчай спадчыны свайго знакамітага земляка. У сценах музея праходзілі сустрэчы і вечарыны, традыцыйнымі былі святкаванні дня нараджэння пісьменніка. Варта ўзгадаць храналогію гэтых свят і назваць імёны пісьменнікаў, што ў розныя гады прыязджалі «да Кузьмы Чорнага» ў Цімкавічы.

У 1970 годзе цімкаўляне сустракалі Я. Скрыгана, В. Вітку, С. Грахоўскага, І. Грамовіча, А. Асіпенку і дэлегацыю з братняй Украіны. Госці свята — настаўнікі і вучні Тарасаўскай васьмігадовай школы Кіева-Свято-

шынскага раёна Кіеўскай вобласці — адзначалі, што добра ведаюць творчасць К. Чорнага, у іх школе ёсць партрэт пісьменніка і кнігі ў перакладзе на ўкраінскую мову.

У чэрвені 1975 года музей наведалі: І. Чыгрынаў, В. Вітка, М. Лобан, М. Хведаровіч, А. Вярцінскі, М. Аўрамчык, намеснік дырэктара Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР Н. Пашкевіч, інструктар ЦК КПБ А. Кудравец. З цікавым і змястоўным дакладам аб жыцці і творчасці Кузьмы Чорнага выступіў навуковы супрацоўнік Акадэміі навук БССР, кандыдат філалагічных навук М. Тычына. Пісьменнік У. Юрэвіч распавёў аб сустрэчах з вядомым празаікам і іх сумеснай працы падчас вайны ў Маскве. Сведчаннем таму была карта БССР з пазначанымі на ёй чырвонымі сцяжкамі вызваленых мясцін Беларусі. У гады вайны яна вісела ў памяшканні радыёстанцыі «Савецкая Беларусь», дзе дыктарам працаваў У. Юрэвіч, а Кузьма Чорны прыходзіў туды як на працу, каб даведацца пра навіны на фронце і ў вызваленых раёнах.

80-гадовы юбілей Кузьмы Чорнага супаў са значнай падзеяй у жыцці музея. У 1980 годзе яму нададзена званне народнага. І зноў на паклон да пісьменніка ў яго музей прыязджаюць родныя і сябры, тыя, хто ўжо неаднойчы быў тут (З. Азгур, В. Вітка, І. Грамовіч, М. Тычына, І. Чыгрынаў) і тыя, хто наведаў Цімкавічы ўпершыню (П. Кавалёў, Я. Брыль, А. Васілевіч, С. Законнікаў, А. Адамовіч, М. Гамолка, А. Русак). Сузор'е такіх людзей на цімкавіцкай зямлі — гэта бясспрэчная пашана і высокае прызнанне як самога пісьменніка, так і яго ўдзячных землякоў.

Шматлюдна было і ў дзень святкавання 85-годдзя з дня нараджэння Кузьмы Чорнага. Даніну памяці выдатнаму майстру слова, яго зямлі і цімкаўлянам прыехалі аддаць сталічныя літаратары — сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. Чыгрынаў, Я. Скрыган, І. Грамовіч, Г. Васілеўская, Я. Янішчыц, Х. Лялько. З дакладам выступаў намеснік дырэктара Інстытута літаратуры Акадэміі навук БССР У. Гніламёдаў.

Традыцыйна святкавалі і 90-гадовы юбілей пісьменніка. На гэты раз у свяце прынялі ўдзел А. Рагуля, В. Супрунчук, А. Жук. На ўрачыстасць была запрошана Зінаіда Іосіфаўна Раманенка, былы дырэктар школы і арганізатар музея.

Заўсёды на юбілейных мерапрыемствах былі і родныя Кузьмы Чорнага — сёстры Марыя і Ганна, дачка Рагнеда, унук Мікола, пляменніцы Святлана і Галіна. З гонарам і хваляваннем згадвалі яны свайго брата і бацьку. Словы іх вялікай удзячнасці гучалі ў адрас землякоў, сяброў пісьменніка і прыхільнікаў яго таленту.

Сёння немагчыма пералічыць усіх гасцей, што пабывалі ў музеі, і назваць іх геаграфію, але асобныя пункты на карце свету абазначыць проста неабходна. Студэнты з краін афрыканскага кантынента, госці з Кубы,

дэлегацыі з Расійскай Федэрацыі, Украіны, Літвы, Канады, Узбекістана, Латвіі, Германіі, Іспаніі.

Прыведзеныя вышэй звесткі — гэта сціплае падсумаванне і ўдзячнасць за творчую дзейнасць усім тым людзям, хто меў непасрэднае дачыненне як да арганізацыі музея, так і да яго шматгадовай паўсядзённай працы.

Канец 1980-х і пачатак 1990-х у жыцці музея, на жаль, не быў плённым. На заслужаным адпачынку ўжо пэўны час знаходзілася Зінаіда Іосіфаўна Раманенка, патрабаваў рамонту будынак, ды і сітуацыя ў грамадстве давала новыя магчымасці для асвятлення жыццёвага і творчага шляху Кузьмы Чорнага.

Новы этап у гісторыі музея пачаўся 15.01.1993 года, калі яму быў нададзены статус дзяржаўнага. У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, філіялам якога стаў музей К. Чорнага, пачалася праца па зборы матэрыялаў, распрацоўцы навуковай і мастацкай канцэпцыі музея. Праз 30 з лішнім гадоў (24 кастрычніка 1994 года) адбылося ўрачыстае адкрыццё экспазіцыі музея.

Новая экспазіцыя музея, у аснову якой пакладзены гісторыка-храналагічны прынцып падачы матэрыялу, асвятляе жыццёвы і творчы шлях Кузьмы Чорнага. Першая зала музея прысвечана дзяцінству і юнацтву вялікага празаіка, другая — творчасці К. Чорнага 1920 — 1930-х гадоў. У трэцяй зале можна даведацца пра яго жыццё і творчасць перыяду ВАВ, а чацвёртая прысвечана ўшанаванню памяці К. Чорнага.

Набыткі народнага музея (самавар, паліто, абрус, кнігі з аўтографамі) і новыя матэрыялы (цікавыя фотаздымкі, карта БССР, некралогі на смерць пісьменніка, ілюстрацыі А. Кашкурэвіча, У. Малахава, М. Гуціева да твораў К. Чорнага і інш.) дазволілі больш поўна раскрыць асобныя моманты біяграфіі пісьменніка.

Для аўтараў экспазіцыі (Л. Макарэвіч і Г. Чысты) было важным паказаць Кузьму Чорнага не толькі як творцу, але і як чалавека з чуйнай адкрытай душой. Невыпадкова выкарыстаны цытаты з аўтабіяграфіі і з дзённіка пісьменніка. Тактоўна ўведзеныя мастаком у кантэкст кожнай тэмы, яны арганічна спалучаюцца з тымі або іншымі экспанатамі і з'яўляюцца неабходным дадаткам да пэўнага экспазіцыйнага комплексу. Як, напрыклад, словы пісьменніка пра маці: «Вялікі ўплыў на развіццё адчуванняў і дум мела маці, жанчына простая, што навучылася чытаць сама праз сябе, але развітая, многа чытаўшая, пачынаючы бібліяй і канчаючы Львом Талстым і палітычнымі ўсякімі брашурамі...» Думаецца, што гэтыя радкі побач з абрусам, вытканым ёй, маюць адпаведнае эмацыянальнае ўздзеянне на наведвальнікаў.

Уведзена ў канву экспазіцыі і шмат іншых сімвалаў і знакаў, якія дазваляюць глыбей зразумець унутраны свет пісьменніка. Так, у першай зале, што прысвечана дзяцінству будучага празаіка, стаіць варштат (кросны)



ЦІМКАВІЧЫ.
ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ
КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

як памяць аб маці і дзеду, што былі славутымі ткачамі. Тут жа змешчана карціна В. Барабанцава «Скіп'ёўскі лес», якая ў гэтым кантэксце таксама набывае сімвалічны сэнс. Любіла Скіп'ёўскі лес маці пісьменніка, у дзяцінстве з дзедам Міхалам хадзіў туды і маленькі Коля, так называлася яго апошняя недапісаная аповесць. Увядзенне такіх дэталей у экспазіцыю, прысвечаную «майстру псіхалагічнай прозы», апраўдана. Наведвальнікі павінны думаць, адчуваць, суперажываць.

Мастак Генадзь Чысты працаваў над афармленнем музея, удала знайшоў вобраз кожнай залы. Асновай мастацкага рашэння сталі малюнкі К. Чорнага. Увасобленыя ў павялічаных аплікацыях, яны з'яўляюцца неад'емнай часткай экспазіцыі, эмацыянальна дапаўняюць яе і робяць цэласным успрыняцце асобы пісьменніка.

Ішоў час, з'яўляліся новыя звесткі, экспанаты, матэрыялы, якія павінны былі заняць сваё месца ў музеі. І вось праз 20 гадоў яны размясціліся ў новых сучасных вітрынах адноўленай экспазіцыі. Гэта, напрыклад, першае апавяданне Міколы Раманоўскага «Гузік», якое было надрукавана ў беларускім дзіцячым часопісе «Зоркі» 25 лютага 1921 года, лісты Кузьмы Чорнага да А. Бабарэкі, П. Кабзарэўскага, сшытак «Пра творчасць Кузьмы Чорнага» І. Мележа, які лічыў К.Чорнага сваім першым літаратурным настаўнікам, фотаздымкі з сямейнага альбома, артыкулы ў сродках масавай інфармацыі аб святкаванні юбілеяў — 100-годдзя і 110-годдзя з дня нараджэння К. Чорнага.

У першай зале, паводле канцэпцыі аўтараў, размясцілася фотавыстава, якая стала вынікам фотапленэра, праведзенага ў 2010 годзе. Сюжэтамі аўтарскіх работ членаў фотаклуба «Мінск» і Беларускага грамадскага аб'яднання «Фотамастацтва» сталі мясціны, якія маюць асаблівы сэнс у жыцці пісьменніка. Гэта маёнтак Боркі, Скіп'ёўскі лес, Радзівілаўскі парк, рачулка Мажа, Бушылаўская крынічка, Капыльская вуліца, Нясвіж і г. д.

Трапна ўведзены ў інтэр'ер кожнай залы наступныя экспазіцыйныя комплексы: куток сялянскай хаты, куток рабочага кабінета ў рэдакцыі газеты «Наша вёска», куток кабінета рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», якая ў той час размяшчалася ў будынку рэдакцыі газеты «Известия» на плошчы А. Пушкіна ў Маскве.

Сёння музей К. Чорнага — гэта своеасаблівы культурны і асветніцкі цэнтр. Пры стварэнні экспазіцыі, па задуме аўтараў канцэпцыі, у першай зале музея змешчаны невялікі столік і лаўкі, што нагадваюць школу 1920-х гадоў. Гэта дае значныя магчымасці для арганізацыі розных форм музейнай дзейнасці. Асаблівае месца займае праца з дзецьмі. Згодна з патрабаваннямі часу ў практыку музея шырока ўведзены музейна-педагагічныя заняткі. Распрацаваны праграмы «Музей і дзеці», «Ганарыся сваім земляком і ведай пра яго», «Наша спадчына». Яны прадугледжваюць

самыя розныя мерапрыемствы — віктарыны, конкурсы, крыжаванкі, святы, чытанні апавяданняў К. Чорнага, тэатралізаваныя прадстаўленні.

Акрамя агляднай экскурсіі, распрацаваны і праводзяцца тэматычныя экскурсіі: «Дзяцінства і юнацтва Мікалая Рамаaccount ўскага» — для выхаванцаў дзіцячага садка і вучняў малодшых класаў, «Пачатак літаратурнай дзейнасці пісьменніка» — для вучняў сярэдніх класаў, а для старшых класаў — «Уклад К. Чорнага ў набліжэнне Перамогі», «Кузьма Чорны і тэатр».

Пры музеі з 1997 года для вучняў сярэдніх і старшых класаў працуе студыя аматараў тэатра «Іскрынка». Удзельнікамі студыі былі інсцэніраваны апавяданні К. Чорнага «Маё дзела цялячае», «Родныя мясціны», аповесць «Насцечка», артыкул «У роднай глушы», п'еса «Базылевічава сям'я», з якімі яны перыядычна выступаюць перад жыхарамі Цімкавіч, вучнямі Цімкавіцкай школы, бібліятэкарамі раёна, гасцямі з Мінска і Капыля. Дарэчы, пасля экскурсіі можна паглядзець адну з гэтых пастановак у відэазапісе. Для выхаванцаў дзіцячага садка і малодшых школьнікаў з 2003 года працуе тэатр фланалеграфіі «Скарбонка прыгажосці».

Думаецца, што гэтыя традыцыі захаваюцца і будучыя пакаленні цімкаўлян будуць шанаваць памяць пра выдатнага земляка — пісьменніка, драматурга, публіцыста.

*2007, 2015*

*Галіна Шаблінская*

# Млечным Шляхам Кузьмы Чорнага

*Прэм'ера радыёспектакля «Млечны Шлях» паводле рамана К. Чорнага на Беларускім радыё ў 2014 годзе*

Прачытанне спадчыны Кузьмы Чорнага ў розных відах мастацтва — яшчэ адно пацвярджэнне геніяльнасці таленту вялікага пісьменніка. Сярод іншых перастварэнняў вобразаў і сюжэтаў класіка на мову музыкі, тэатра, жывапісу, кіно можна асобна гаварыць пра такі ўнікальны мастацкі жанр, як радыётэатр, які існуе на Беларускім радыё яшчэ з 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Свая, самабытная, старонка належыць у ім К. Чорнаму.

Паводле яго твораў у фондах Беларускага радыё захоўваюцца каля 20 радыёспектакляў, пастановак, інсцэніраваных апавяданняў. Першыя запісы «Вясковая ветэрынарыя» і «Як дзядзька Тамаш напалохаў ваўкоў» пазначаны 1956-м годам, а прэм'ера апошняга радыёспектакля «Млечны